# ПАМЯТКА
## па ажыццяўленні мерапрыемстваў у сферы аховы нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны ў 2021 – 2022 гадах
(для мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў абласнога і базавага тэрытарыяльных узроўняў)

У адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры (далей – Кодэкс) захаванне нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны ўключае ў сябе сістэму арганізацыйных, прававых, эканамічных, матэрыяльна-тэхнічных, навуковых, інфармацыйных і іншых мер, накіраваных на стварэнне ўмоў для бытавання, развіцця і перадачы нашчадкам нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Артыкуламі 14, 103, 107 Кодэкса, артыкуламі 17, 41 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь» рэалізацыя мерапрыемстваў па захаванню нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей ускладзена на мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы.

У мэтах удасканалення сістэмы аховы нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны, выканання патрабаванняў міжнародных дагавораў і нацыянальнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь, арганізацыі работы па захаванню нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей у 2021 – 2022 гадах **неабходна прадугледзець**:

1. Безумоўнае выкананне прыярытэтных і актуальных задач ў сферы аховы нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны, у тым ліку:

- распрацоўку комплексаў мерапрыемстваў па ахове нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны ў рамках рэгіянальных праграм, у тым ліку праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця;
- планаванне фінансавых сродкаў на рэалізацыю комплексаў мерапрыемстваў па ахове нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны (Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 ліпеня 2016 года № 289 «Аб парадку фарміравання, фінансавання, выканання і ацэнкі эфектыўнасці рэалізацыі дзяржаўных праграм», артыкулы 17, 41 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь», артыкулы 21, 22, 209 Кодэкса);
- выкананне пунктаў 1, 2, 4 рашэння калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 22.10.2020 № 111;

- падрыхтоўку ў 2021 годзе перыядычнай справаздачы аб выкананні Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА;

- выяўленне нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека для надання ім статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці;

- павышэнні ролі Дамоў культуры, рамёстваў, музеяў і іншых устаноў культуры ў захаванні нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны.

2. Распрацоўку комплексаў мерапрыемстваў па ахове нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны пры фарміраванні і зацвярджэнні рэгіянальных праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2021 – 2025 гады (Інструкцыя аб патрабаваннях да структуры дзяржаўнай праграмы і зместу справаздач аб выніках рэалізацыі дзяржаўнай праграмы, зацверджаная пастановай Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь ад 19 жніўня 2016 года № 51, Інструкцыя аб парадку прымянення бюджэтнай класіфікацыі, зацверджаная пастановай Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2008 года № 208). Пры гэтым:

- уключаць у комплексы мерапрыемстваў па ахове нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей пры фарміраванні і зацвярджэнні рэгіянальных праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2021 – 2025 гады:

- аб’ёмы фінансавання;

- маніторынг стану элементаў (мінімум 1 раз у 2 гады);

- меры, накіраваныя на перадачу нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей ад носьбіта да пераемніка (арганізацыя і падтрымка разнастайных форм пераемнасці);

- даследаванне элементаў (супрацоўніцтва з навукова-даследчымі, адукацыйнымі арганізацыямі);

- падрыхтоўку прапаноў аб уключэнні новых нематэрыяльных культурных каштоўнасцей у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь;

- заахвочванні (у тым ліку матэрыяльныя) носьбітаў нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь;

- інвентарызацыю нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей з абавязковым накіраваннем актуальных звестак аб іх у адрас Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»